Вольга ФЕДАРОВІЧ:

«ШАШЫСТЫ — ЗВЫЧАЙНЫЯ ЛЮДЗІ»

Чаму ў гэты від спорту ідуць дзеці і чым ён адрозніваецца ад звычайнай аматарскай гульні

У абноўленым 1 студзеня сусветным жаночым рэйтынгу шашыстаў на першым радку аказалася 25-гадовая беларуска. Такі поспех першы не толькі для самой Вольгі, але і для нашай краіны: дагэтуль ніхто з суайчыннікаў не ўзначальваў гэты спіс. Вольга Федаровіч абышла знакамітых саперніц з Латвіі і Украіны. Гэта стала добрай нагодай прыгледзецца да шашак бліжэй і даведацца, наколькі гэты від спорту развіты ў Беларусі. У сваім інтэрв'ю Вольга расказала, што самае галоўнае ў шашках, ці дапамагаюць навыкі, набытыя за сталом, у штодзённым жыцці і ці можна зарабіць з дапамогай гэтай гульні.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Вольга, раскажыце, чаму ваш выбар прыпаў менавіта на шашкі?

— У сям'і ў мяне ніхто ў іх не гуляў, мама больш звязана з творчай дзейнасцю — музыкай, арганізацыяй свят, хіба толькі дзядуля, але і той гуляў у шахматы. А нас з сястрой (дзяўчаты двайняты) паклікала ў гурток шашак сяброўка, тады мы вучыліся ў школе. Крыху пазней перайшлі ў Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках, з гэтага моманту пачалі займацца ўжо прафесійна.

Усё развівалася неяк само сабой, спачатку ўдзельнічалі ў гарадскіх спаборніцтвах, ужо там на нас з сястрой звярнулі ўвагу трэнеры. На спаборніцтвы за мяжу выехалі, калі было 12—13 гадоў, гулялі маладзёжныя турніры. Бацькі адпускалі спакойна, мама ездзіла з намі толькі адзін раз.

— Як аднагодкі рэагавалі на такое ваша захапленне?

— Здзіўляліся, калі даведваліся, што шашкі могуць быць сур'ёзным захапленнем, але ж людзі аддаюць гэтаму віду спорту ўсё жыццё. А вось выкладчыкі нас не разумелі і не любілі, таму што мы прапускалі шмат заняткаў, але заўсёды ўсё роўна ўсё паспявалі.

— Крыўдзіць меркаванне, што шашкі — гэта не спорт?

— Не, я да гэтага ўжо прывыкла і абсалютна спакойна рэагую на такія выказванні. Кожны сам выбірае, чым яму займацца.

— У першы дзень 2018 года вы ўзначалілі сусветны рэйтынг сярод жанчын. Як да гэтага паставіліся?

— Для мяне гэта было вельмі нечакана, таму што я не падлічвала свае ачкі, ад гэтага і эмоцый было шмат. У цэлым для мяне 2017 год быў добрым у плане спартыўных вынікаў. Я стала другой на чэмпіянаце свету, нядрэнна правяла нядаўнія турніры і таму паднялася на першы радок рэйтынга. Раней самае высокае месца ў ім у мяне было 4-е ці 6-е. Шчыра кажучы, гэты рэйтынг фармальны, мы не атрымліваем ад яго ні фінансавага прыбытку, ні чагосьці іншага. Да таго ж першая дзясятка — гэта гульцы прыкладна аднаго ўзроўню.

— Якія краіны можна назваць самымі паспяховымі ў шашках?

— Вядома, Беларусь, Расія на высокім узроўні, у мужчынскім рэйтынгу першую пяцёрку займаюць менавіта спартсмены з гэтай краіны. Латвія, Украіна маюць добрую рэпутацыю, калі браць больш далёкую Еўропу, то Галандыя — адзін з лідараў. Там шашкі развіты вельмі добра, у іх гуляюць многія, нават проста на аматарскім узроўні, праводзіцца шмат турніраў.

Гадоў 10 таму ў гэтым кірунку пачаў развівацца і Кітай, у іх ужо з'явіліся добрыя моцныя гульцы. Такі хуткі рост адбываецца за кошт таго, што яны актыўна запрашаюць да сябе ў якасці трэнераў гросмайстраў.

Некалькі гадоў таму пачалі развіваць шашкі ў Турцыі, але пакуль у іх недастаткова настаўнікаў.

— Чым адрозніваецца аматарская гульня ад прафесійнай?

— Для аматараў шашкі гэта проста правядзенне вольнага часу, многія нават правілы да канца не ведаюць. А прафесійна людзі з маленства вучацца будаваць камбінацыі, пралічваць хады на некалькі крокаў наперад, рабіць так, каб аддаць адну шашку, а забраць 2—3.

— Поспех у большай ступені залежыць ад напружаных трэніровак або таленту?

— Ва ўсіх па-рознаму. Ёсць людзі, якія рэальна маюць талент і ім не трэба шмат працаваць, такі шашыст ёсць у нас у Ваўкавыску, ён гуляе на маленькай дошцы і сёння адзін з найлепшых у свеце.

У каго здольнасцяў менш, таму даводзіцца больш працаваць, каб за кошт трэніровак дамагчыся выніку. Такое таксама магчыма. Я — гэта 50% таленту і 50% працы, у дзяцінстве шмат трэніравалася, цяпер гуляю больш на вопыце.

— За сталом мужчыны сустракаюцца з жанчынамі...

— Так, такое бывае. У гэтым відзе спорту мужчыны значна мацнейшыя, у іх іншы склад розуму, іншае мысленне. Стыль гульні зусім розны, яны могуць пралічваць сітуацыі нашмат лепш і да канца. Мне здаецца, мужчыны больш прафесійна ставяцца да гульні. Жанчыне-шашыстцы высокага ўзроўню практычна немагчыма абыграць мужчыну-шашыста таксама высокага ўзроўню. Але калі такія гульні здараюцца, то гэта вельмі добрая практыка для слабага полу.

— Якімі якасцямі неабходна валодаць, каб дасягнуць поспеху ў шашках?

— Партыя ў класічных шашках доўжыцца каля пяці гадзін, гэта велізарная псіхалагічная нагрузка, таму добраму спартсмену трэба быць вельмі ўстойлівым у гэтым плане. Часта сустракаюцца неўраўнаважаныя спартсмены, гэта праяўляецца ў велізарным хваляванні, з-за чаго ўзнікаюць простыя памылкі. У іх могуць трэсціся рукі і гэтак далей.

Акрамя таго, на працягу гульні неабходна захоўваць канцэнтрацыю і ўмець абстрагавацца ад навакольнага асяроддзя. Многае тут залежыць ад тэмпераменту чалавека, мне справіцца з хваляваннем і захоўваць спакой нескладана.

— Ці дапамагаюць гэтыя якасці вам у жыцці?

— Вядома. Умею пралічваць сітуацыю, пераношу гэты навык і на жыццё, недзе думаю не на адзін крок наперад, а больш. Плюс шашкі навучылі мяне ўседлівасці і дысцыпліне.

— Ёсць сакрэты, як на працягу пяці гадзін захоўваць канцэнтрацыю?

— Не, ды гэта і не заўсёды атрымліваецца. Пакуль сапернік думае, можна трохі расслабіцца, падумаць пра штосьці іншае. Бывае ў галаве круціцца якая-небудзь песня і тады так складана пазбавіцца ад яе *(смяецца)*. Падчас партыі ты можаш устаць, прайсціся, папіць кавы ці чаю, штосьці з'есці.

— Падчас экзаменаў вучням раяць есці шакалад, каб павысіць разумовыя здольнасці, у вас ёсць нейкія парады па харчаванні падчас гульні?

— Не, асаблівых няма, але салодкае, думаю, любяць усе шашысты.

— Ці можна з дапамогай вывучэння саперніка нейкім чынам падрыхтавацца да гульні?

— Так, гэта часам дапамагае, бо ў кожнага свой стыль. Напрыклад, можна зразумець як сапернік пачне сваю партыю, але праз 2—3 хады ўсё можа пайсці па-іншаму, таму арыентавацца прыходзіцца па сітуацыі.

— Які турнір лічыцца самым прэстыжным у вашым відзе спорту?

— Чэмпіянаты свету і Еўропы, якія чаргуюцца кожны год. Ёсць і камерцыйныя турніры, трапіць на якія вельмі прэстыжна. Напрыклад, нядрэнныя спаборніцтвы ў Кітаі называюцца «Інтэлектуальныя гульні», яны ўключаюць у сябе пяць відаў — шашкі, шахматы, кітайскія шахматы, го і брыдж. Каб трапіць туды, неабходна прайсці адбор, у турніры па шашках прымаюць удзел усяго восем жанчын. Ён цікавы і ў фінансавым плане, грошы атрымліваю не толькі пераможца, але і ўсе ўдзельнікі.

— Наогул зарабіць на жыццё шашкамі можна?

— Напэўна, бо гэты від спорту складана сумяшчаць з працай. Наўрад ці якому-небудзь работадаўцу спадабаецца, што ты пастаянна адпрошваешся на турніры. Паездкі на камерцыйныя спаборніцтвы часта даводзіцца аплачваць самім, але бываюць і выключэнні. Прызёры чэмпіянатаў свету і Еўропы таксама атрымліваюць прызавыя ў некалькі тысяч еўра, плюс калі ты трапляеш у тройку наймацнейшых, то ў канцы года можаш разлічваць на прэмію ад Міністэрства спорту.

— Якія вашы мэты сёння?

— Рэйтынг — рэч зменлівая, праз тры месяцы ачкі пералічаць, таму на яго не арыентуюся. Сёлета хачу больш часу ўдзяліць трэніроўкам, калі ты дзіця, то прымушаюць трэніравацца бацькі або настаўнік, а цяпер трэба матываваць сябе самой. Буду працаваць, каб быць больш стабільнай і павышаць узровень сваёй гульні.

— Ваша сястра Дар'я таксама гуляе ў шашкі, ці існуе паміж вамі канкурэнцыя?

— Была толькі ў дзяцінстве, нам не хацелася адставаць адна ад адной. Адна згуляе добра, і гэта выдатная матывацыя для другой, адразу хочацца дагнаць. А зараз мы падтрымліваем адна адну, радуемся поспехам. У нас нават ёсць плюс, таму што можам трэніравацца разам у любы час, хоць гуляем на розных дошках (Дар'я на маленькай дошцы 8х8), таму не заўсёды гэта мае сэнс.

— Кажуць, у двайнят і блізнят існуе асаблівая сувязь.

— Можа, нешта такое і ёсць. Калі ездзім на турніры асобна, сяджу дома і стараюся пасылаць сястры станоўчую энергетыку падчас гульні. Неяк яна была на спаборніцтвах у Піцеры, пару гульняў згуляла няўдала, я вырашыла падтрымаць Дашу і спантанна адправілася ў Санкт-Пецярбург. Пасля гэтага ўсё наладзілася, яна стала перамагаць. Магчыма, гэта толькі супадзенне, але ўдзвюх мы адчуваем сябе больш упэўнена.

— Чым займаецеся акрамя шашак?

— Я атрымала вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці псіхолаг, цяпер вучуся ў БДУФК на трэнера. Магчыма, у будучыні гэта спатрэбіцца, думаю, рана ці позна я пачну трэніраваць дзяцей. Гэта заканамерна: ты праходзіш этап атрымання ведаў, а потым табе трэба іх каму-небудзь перадаць. У шашках няма ўзроставых абмежаванняў, можна добра гуляць і ў 70 гадоў, але не думаю, што гэта мой шлях.

А што датычыцца вольнага часу, то займаюся і іншымі відамі спорту, з дзяцінства мама прывучыла раніцай рабіць зарадку, з сястрой ходзім катацца на каньках, гуляць у настольны тэніс, бадмінтон, бо гэта вельмі карысна — змяняць від дзейнасці.

Калі я на турніры ў іншым горадзе, то люблю проста прагуляцца па незнаёмых вуліцах, паглядзець штосьці новенькае.

Названы ўладальнікі прэміі «Беларускі спартыўны Алімп»

Прэзідэнт краіны падпісаў указ, згодна з якім прэміі ўдастоена галоўны трэнер нацыянальнай каманды па скачках на батуце Вольга Уласава за падрыхтоўку спартсменаў высокага класа, пераможцаў і прызёраў Алімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў свету і Еўропы. Яна выхавала плеяду батутыстаў, сярод якіх алімпійскі чэмпіён 2016 года Уладзіслаў Ганчароў, а таксама пераможцы і прызёры чэмпіянатаў свету і Еўропы.

Лаўрэатам прэміі стаў спецыяльны карэспандэнт аддзела каментатараў галоўнай дырэкцыі тэлеканала «Беларусь 5», заслужаны дзеяч культуры Уладзімір Навіцкі. Ён з'яўляецца адным з самых вядомых спартыўных каментатараў і вопытных супрацоўнікаў Белтэлерадыёкампаніі, членам некалькіх спартыўных федэрацый, суаўтарам і вядучым штотыднёвага ток-шоу «Вялікі спорт», спецыяльнага праекта «Авертайм: КХЛ». Уладзімір Навіцкі прадстаўлены да спецыяльнай прэміі за значны асабісты ўклад у прапаганду здаровага ладу жыцця, папулярызацыю фізічнай культуры і спорту сярод шырокіх слаёў насельніцтва.

Дыплом лаўрэата прэміі за паспяховае выступленне на міжнародных спаборніцтвах, актыўную грамадзянскую пазіцыю, паважлівае стаўленне да дзяржаўных сімвалаў атрымае член нацыянальнай каманды па лёгкай атлетыцы, майстар спорту Віялета Скварцова. У юніёрскай узроставай катэгорыі спартсменка, якая выступае ў трайным скачку, заваявала тытулы чэмпіёнкі Беларусі 2016 года, чэмпіёнкі Еўропы 2017 года і ўстанавіла рэкорд Беларусі.

Нагадаем, на цырымоніі ўзнагароджвання кантынентальнага першынства Віялета Скварцова, нягледзячы на пагрозу санкцый, пакінула п'едэстал у знак пратэсту супраць выканання гімна іншай краіны замест Дзяржаўнага гімна Беларусі. Відэаролік з учынкам спартсменкі сабраў на YouTube 8,3 млн праглядаў і 17 тыс. каментарыяў.

Суперфінал у Мінску

З 12 па 14 студзеня «Чыжоўка-Арэна» прыме вырашальныя матчы Кантынентальнага кубка па хакеі

Сапернікамі мінскага «Юнацтва» стануць казахстанскі «Намад», італьянскі «Рытэн Спорт» і «Шэфілд Сцілерз» з Вялікабрытаніі. У гэтым сезоне мінская каманда стартавала ў турніры з паўфінальнай стадыі, у сярэдзіне лістапада ў Даніі датэрмінова заваяваўшы пуцёўку ў суперфінал у саперніцтве з брытанскім «Шэфілдам», латвійскім «Курбадсам» і дацкім «Рунгсэдам». Нагадаем, пераможца Кантынентальнага кубка заваюе пуцёўку ў Лігу чэмпіёнаў на наступны сезон.

З беларускіх клубаў найбольшых поспехаў у Кантынентальным кубку дамагалася менавіта мінскае «Юнацтва», каманда ўдзельнічала ў васьмі розыгрышах. Найбольш удалымі аказаліся выступленні ў 2007 і 2011 гадах, калі мінскі клуб стаў уладальнікам трафея. У 2015 годзе Кантынентальны кубак заваяваў гродзенскі «Нёман».

У 2010 і 2012 гадах мінскае «Юнацтва» заняло другое месца. У 2004 годзе другім быў таксама «Гомель», а ў 2013-м — жлобінскі «Металург».

Уваход на трыбуны «Чыжоўка-Арэны» будзе ажыццяўляцца па запрашальных білетах. Іх можна атрымаць у касах арэны і крытага катка ХК «Юнацтва-Мінск», у адны рукі не больш за пяць білетаў на канкрэтны матч, паведамляецца на сайце мінскага клуба.

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by